**Тым, хто цікавіцца сённяшнім развіццём мастацкай адукацыі ў нашай краіне, думаецца, будзе карысна наведаць дзве выставы: адну — у сталічнай галерэі "Універсітэт культуры" і другую — у Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі. Убачаныя экспазіцыі дазволяць зірнуць на адукацыйны працэс у нашых установах сярэдняй спецыяльнай і дадатковай адукацыі ў перспектыве, прычым і ў гістарычнай перспектыве адной канкрэтнай установы, і ў перспектыве творчага сталення саміх дзяцей. Вось як яны малююць у чатыры гадкі, вось — у восем, вось — у дванаццаць і шаснаццаць... А што далей? А далей назаўжды сонца на далонях, святло ў душы. І часцей за ўсё — шчаслівая прафесійная кар'ера...**

# Сонца на далонях, святло ў душы


Аляксей Клышко, Настасся Бандарэнка, Настасся Стэльмахова (усім па 15 гадоў). Алень. Кіраўнік В.А.Навагран.


Алеся Скорабагатая. Народны каляндар (2008 г.). Купалле. Кіраўнік А.А.Карповіч.


Яўгенія Прышчэпная. Кіраўнік А.В.Свірыдэнка.


Іван Балашоў (8 гадоў). Кіраўнік А.Я.Саковіч.

У галерэі "Універсітэт культуры" надоечы пачала працаваць выстава работ навучэнцаў і выпускнікоў Мінскай дзяржаўнай гімназіі — каледжа мастацтваў "Сонца на далонях", прымеркаваная да 40-годдзя з дня адкрыцця першай у Беларусі школы з мастацкім ухілам на базе мінскай сярэдняй школы № 26. Можна доўга распавядаць пра гісторыю гэтай установы, што мы аднойчы ўжо рабілі ў нашай газеце, але лепш засяродзіцца на сучаснасці, угрунтаванай у мінулае. Сёння Мінская дзяржаўная гімназія — каледж мастацтваў — гэта адмысловая краіна, у якой жывуць вельмі цікавыя і незвычайныя людзі, улюбёныя ў мастацтва. Адны з іх, натуральна, педагогі, усё сваё жыццё прысвяціліі стварэнню Прыгажосці, другія ж робяць толькі першыя крокі на шляху да яе.


Павел Кузьміч. Свяцільні "Гульня святла". Кіраўнік В.Л.Маркаўцова.

Ужо болей за дзесяць гадоў навучальную ўстанову ўзначальвае таленавіты кіраўнік Лілія Аляксееўна Міцура, між іншым, адзіная ў нашай краіне жанчына-педагог, узнагароджаная ордэнам Прасвятой Ефрасінні Полацкай за вялікі ўклад у духоўнае адраджэнне дзяцей і моладзі. Яе "правая і левая рукі", што тычыцца куратарства над дзейнасцю педагагічнага складу, гэта намеснікі дырэктара — заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь сябра Беларускага саюза мастакоў Яўген Мікалаевіч Саковіч і Святлана Мікалаеўна Данская. Ва ўстанове створана ўнікальная аўтарская мадэль пабудовы мастацкай адукацыі на ўсіх трох узроўнях: у пачатковай школе (2—4 класы), у гімназіі (5—11 класы) і ў каледжы (тры гады навучання). Дарэчы, пасля заканчэння каледжа выпускнікі становяцца прафесіяналамі ў спецыялізаванай галіне — графічным дызайне. 98 працэнтаў выпускнікоў працягваюць вучобу ва ўстановах вышэйшай адукацыі мастацкага профілю. А асаблівая гордасць гімназіі-каледжа — гэта 24 стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Сапраўдным набыткам установы з'яўляюцца педагогі-мастакі, якія сумяшчаюць рэдкі дар уласнага мастацкага майстэрства і ўменне перадаваць яго сваім вучням. Гэта Алена Аляксееўна Карповіч, Тамара Генадзьеўна Шэлест, Наталля Барысаўна Разуменка, Юлія Валер'еўна Касцюкевіч, Генадзь Уладзіміравіч Сухамлінаў, Міхаіл Міхайлавіч Гаўрыленка, Марына Георгіеўна Лагунова і многія іншыя. Сярод выпускнікоў гімназіі-каледжа такія вядомыя сёння творцы, як мастакі Усевалад Шваб, Аляксандр Даманаў, Алеся Скорабагатая, графікі Раман Сустаў, Жанна Гладко, дызайнеры Ганна Гарбачэўская, Міхаіл Гурыновіч, Андрэй Ярашэвіч... А колькі яркіх зорачак вучыцца ва ўстанове сёння, тых, каго, несумненна, чакае яшчэ вядомасць і пашана! І як было "справіцца" з такім багаццем арганізатарам выставы, каб паказаць у экспазіцыі ўсю красу?

Педагог Алена Аляксееўна Карповіч гаворыць, што адзінай складанасцю ў арганізацыі выставы было, сапраўды, адабраць лепшыя творчыя работы з усёй разнастайнасці. Але што значыць лепшыя? Штогод з гімназіі-каледжа выходзяць каля 50 выпускнікоў, і, як мінімум, 10 дыпломных работ, па словах Алены Аляксееўны, гэта "проста супер". Адметнасцю сённяшняй экспазіцыі ў галерэі "Універсітэт культуры" якраз і стала вялікая колькасць менавіта дыпломных творчых работ — графічных і жывапісных, з якіх потым рабіліся календары, плакаты і кнігі, твораў у матэрыяле, дэкаратыўна-прыкладных рэчаў (батык, габелены, кераміка, саломапляценне). І толькі адна зала цалкам аддадзена менавіта дзіцячай творчасці. З яе, думаецца, і варта пачаць агляд экспазіцыі, а напрыканцы зноў вярнуцца — каб адчуць і зразумець, што ўсё бярэцца аднекуль і не сыходзіць у нікуды...

А ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі сёння экспануецца выстава творчых работ выхаванцаў народнай студыі Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі "Светач". Работы дзяцей развешаны па ўсёй прасторы МДПДіМ: у выставачнай зале, у холах, на балконах... Самая юная ўдзельніца выставы — чатырохгадовая Софія Аракчэева, якая звярнуецца да гледачоў: "Прывітанне! Я нарадзілася 14 снежня 2008 года. Я люблю весяліцца з сябрамі ў дзіцячым садку, падарожнічаць з татам і мамай, разглядаць кніжкі з прыгожымі ілюстрацыямі. А яшчэ я вучуся танцаваць у дзіцячым калектыве "Равеснік". Але больш за ўсё я люблю маляваць. Я малявала заўсёды, нават калі мне было 8 месяцаў. Я планую быць мастачкай (а па выхадных — балерынай)".

Кіраўнік студыі Уладзімір Мікалаевіч Шчаўкун адзначае ў работах Софіі арыгінальнасць мыслення, своеасаблівыя характарыстыкі персанажаў, незвычайны аўтарскі стыль і шчыра верыць, што яго выхаванка ўвойдзе ў гісторыю беларускага дзіцячага малюнка.

Гэтая гісторыя здзяйсняецца сёння, на нашых вачах.

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*
**Фота аўтара.**


Антон Матусевіч. Свяцільні "Святло і цень". Кіраўнік М.Г.Лагунова.

Софія Аракчэева. Клятчасты тата і карункавая мама. Кіраўнік У.М.Шчаўкун.





Софія Аракчэва. Клаўнеса. Кіраўнік У.М.Шчаўкун.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ